3. Составление синквейна с примерами [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://lewe.ru/sostavlenie-sinkvejna-s-primerami. – Дата доступа: 24.04.2022.
4. Что такое облако слов? [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://wordscloud.pythonanywhere.com/faq.html. – Дата доступа: 22.04.2022.

# ПРЫЁМЫ І СРОДКІ ФАРМІРАВАННЯ МАТЫВАЦЫІ ШКОЛЬНІКАЎ ДА ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

*Сакалоўская Г.В.,*
*ДУА «Сярэдняя школа № 39 г.Магілёва»,*
*г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя.** У артыкуле апісваюцца актыўныя сродкі і прыёмы навучання, якія паказалі сваю эфектыўнасць у практыцы работы па фарміравання матывацыі школьнікаў да вывучэння беларускай мовы і літаратуры.

**Resume.** The article describes the active means and methods of teaching, which have shown their effectiveness in the practice of motivating schoolchildren to study the Belarusian language and literature.

**Ключавыя словы:** актыўныя сродкі і прыёмы навучання; гульнявыя хвілінкі; хвілінкі кемлівасціаданні на логіку; праблемныя сітуацыі; дыспуты.

**Key words:** active learning tools and techniques; game minutes; minutes of ingenuity on logic; problematic situations; disputes

У сучасным грамадстве назіраецца тэндэнцыя індывідуалізацыі асобы, яе імкненне да самавызначэння і самарэалізацыі. Як адзначаецца ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, адным з асноўных кірункаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы навучання з’яўляецца «стварэнне неабходных умоў для задавальнення патрэб асобы ў адукацыі, патрэб грамадства і дзяржавы ў фарміраванні асобы» [1].

Але як фарміраваць асобу ў сітуацыі двухмоўя? Супярэчнасць заключаецца ў тым, што грамадзяне Рэспублікі Беларусь не імкнуцца асэнсаваць сябе беларусамі, бо не размаўляюць на роднай мове. Актуальнасць абранай тэмы абумоўлена задачамі павышэння матывацыі школьнікаў да вывучэння роднай мовы. Сёння на беларускую і рускую мову адведзена аднолькавая колькасць гадзін, але дзеці, якія вымушаны жыць у рускамоўным асяроддзі, не бачаць перспектыў у вывучэнні беларускай мовы. Незапатрабаванасць беларускай мовы ў грамадстве вымушае часам вучняў ахвотней размаўляюць на англійскай мове, чым на беларускай. Я як настаўнік беларускай мовы і літаратуры задумалася, як можна пераадолець гэты “матывацыйны вакуум”. Мяне непакоіць тое, як вучыць дзяцей, каб вучні кожны раз адкрывалі для сябе нешта новае, імкнуліся да станоўчых вынікаў.

Развіццё ніколі не можа быць дасягнута шляхам прымусу, яно мае месца толькі тады, калі чалавек сам цягнецца да ведаў, да творчасці [2, с. 3]. Асэнсаванне гэтага пераканала мяне ў тым, што работу на ўроку патрэбна арганізаваць так, каб павысіць унутраную матывацыю школьнікаў да вывучэння прадмета, каб у вучняў з’явілася жаданне працаваць на ўроку, каб яны з павагай ставіліся да вывучэння роднай мовы. Для гэтага прадметны матэрыял трэба падаць так, каб вучні не толькі зразумелі вывучаемы матэрыял, але і маглі прымяніць яго на практыцы.

Зыходзячы з канцэпцыі літаратурнай і моўнай адукацыі, пры правядзенні ўрокаў неабходна кіравацца двума асноўнымі прынцыпамі: аперацыйным і матывацыйным [3].

У сваёй працы я карыстаюся актыўнымі сродкамі і прыёмамі навучання, якія паказалі сваю эфектыўнасць у практыцы работы: займальны матэрыял, гульнявыя хвілінкі, хвілінкі кемлівасці ў 5-6 класах, заданні на логіку, праблемныя сітуацыі, дыспуты ў 7-8 класах, нетрадыцыйныя ўрокі, інтэграваныя ўрокі, электронныя сродкі навучання, складанне прэзентацый, відэасюжэтаў у 8-9 класах і інш. Я часта праводжу ўрокі з элементамі гульнёвай тэхналогіі, інтэрактыўнага навучання, асобасна-арыентаваных тэхналогій, якія фарміруюць у дзяцей лідэрства, вопыт самавызначэння, працы ў групе, рэфлексіі. Вучэбныя заданні да ўрока падбіраю з элементамі навізны, асаблівую ўвагу надаю працы з тэкстам: выкарыстоўваю тэксты этнаграфічнага, патрыятычнага зместу. У рамках ўрока ўцягваю вучняў у дыскусіі, дэманструю відэафільмы па тэме, арганізую інтэграваныя ўрокі з бібліятэкай. Напрыклад, разам з вучнямі 4 класа мы стварылі беларускамоўны канал з віншаваннямі ў інтэрнэце, каб можна было адсылаць віртуальныя паштоўкі. Назву сайта – Пуцявінка – прыдумалі вучні 8-га класа, якіх ідэя зацікавіла. На працягу некалькіх месяцаў мы не толькі размяшчаем там тэкставыя файлы, але і відэаматэрыял, прысвечаны розным святам.

Прааналізаваўшы праграму па беларускай літаратуры, я прыйшла да высновы, што развіваць матывацыю да вывучэння беларускай літаратуры лепей на творах патрыятычнага зместу (раздзел «Роднае слова», 5 клас, «Мой род, родная зямля, народ», 6 клас), на творах пейзажнай лірыкі (Я.Колас «Ручэй», 7 клас, М. Багдановіч «Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог…», 8 клас і інш.), творах ваеннай тэматыкі (М. Лынькоў «Васількі», 5 клас, В. Быкаў «Жураўліны крык», 8 клас), а таксама творах гістарычнай тэматыкі (Л. Случанін «Рагнеда», 6 клас і інш).

У сярэднім звяне яшчэ можна выкарыстоўваць прыёмы гульні. У 5-ым класе пры вывучэнні твора П. Броўкі «Калі ласка» праводжу конкурс кемлівых. На дошцы запісаны словы *лекар, ікар, бур, жука, аліва, крук, жука, аб, скол, раса, кладка.* Прапануецца замяніць першыя літары, каб атрымаліся новыя словы і з першых літар гэтых слоў можна было скласці імя вядомага беларускага паэта, жыццё і творчасць якога будзе вывучацца на ўроку.

У 7-ым класе на ўроку літаратуры У. Караткевіч «Зямля пад белымі крыламі» прапаную заданне на логіку, кемлівасць: «Хто? Што?». Патрэбна падабраць да прозвішча аўтара назву яго твора і вызначыць аўтара, твор якога яшчэ не вывучалі. Гэта і будзе з’яўляцца тэмай урока. Я. Колас «Ручэй», І. Навуменка «Настаўнік чарчэння», У.Караткевіч «Зямля пад белымі крыламі».

Лічу, што абавязкова на ўроку павінна быць эмацыянальная насычанасць зместу матэрыялу. Пагэтаму стараюся на арыенціровачна-матывацыйным этапе стварыць псіхалагічны настрой, выклікаць жаданне займацца прадметам: чытаю некалькі радочкаў з вершаў беларускіх паэтаў, якія адпавядаюць тэме ўрока. Або ў пачатку ўрока праводжу работу з асацыяцыямі. Напрыклад, пры вывучэнні ў 6-ым класе твора У. Караткевіча «Алені» папрасіла вучняў з дому прынесці адну рэч, якая ў іх асацыіруецца са словам «дабрыня». Нехта прынёс плюшавую цацку, нехта кнігу, нехта фотаздымак маці і інш. Абавязковая ўмова пры гэтым: патлумачыць, чаму менавіта гэтая рэч выклікала асацыяцыю са словам «дабрыня». Эмоцыі зашкальваюць.

У 8-ым класе пры вывучэнні аповесці В. Быкава «Жураўліны крык», каб вучні ўключыліся ў працу, на арыенціровачна-матывацыйным этапе ствараю сітуацыю поспеху: высвятляю веды вучняў пра пачатак Вялікай Айчыннай вайны, станоўча ацэньваю іх выказванні. Потым ствараю праблемную сітуацыю, стаўлю пытанне, на якое вучні яшчэ не ведаюць адказу: дзе былі немцы ў жніўні-верасні 1941 года і якая задача стаяла перад нашай арміяй на фронце? Потым пераходжу да задачы, якую паставіў старшыня Карпенка перад сваімі байцамі. У дадзеным выпадку важна даць зразумець вучням, што дзеянне ў творы адбываецца на адным з чыгуначных пераездаў паміж Віцебскам і Смаленскам. Калі практыкаваць такі від работы планамерна, то ён значна павышае зацікаўленасць вучняў

прадметам, а яшчэ вучыць знаходзіць патрэбную інфармацыю ў інтэрнэце, пераапрацоўваць яе і ўкараняць практычна праз камп'ютарныя праграмы.

Выкарыстанне актыўных сродкаў і прыёмаў на ўроках беларускай мовы дае наступныя вынікі: актывізаваўся ўдзел вучняў у літаратурных праектах, інтэрнэт-гульнях і разнастайных творчых конкурсах раённага, гарадскога і абласнога ўзроўню; назіраецца рост зацікаўленасці вучняў факультатыўнымі заняткамі; высокая актыўнасць школьнікаў назіраецца ў правядзенні пазаўрочных мерапрыемстваў, прысвечаных пісьменнікам-юбілярам, Дню славянскай пісьменнасці, Тыдню беларускай мовы і інш.

**Спіс выкарастаных крыніц:**

1. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб Адукацыі ад 13 студзеня 2011 г. № 243-З. – Мінск. Нац. цэнтр прававой інфармацыі Рэсп. Беларусь.

2. Вахільчук, А. С., Качаноўская, В. В., Літвінчык, С. В. Матывацыйная дзейнасць настаўніка на ўроках беларускай мовы 5-10 класы: дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных устаноў з 12-гадовым тэрмінам навучання / А. С. Вахільчук і інш. – Мазыр: ТАА ВД “Белы вецер”. – 2008. – 147 с.

3. Алынук, С. І. Навучанне школьнікаў самастойнай навукова-пошукавай дзейнасці / С. І. Алынук // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 2006. – № 5.

## ШКОЛА И МЕСТНОЕ СООБЩЕСТВО – ВМЕСТЕ К УСТОЙЧИВОМУ РАЗВИТИЮ

*Семенова Т.С.,*
*ГУО «Ходосовская средняя школа» Мстиславского района,*
*Республика Беларусь*

**Аннотация.** Педагоги и учащиеся ведут активную работу по объединению разрозненных действий участников школьного сообщества и жителей территории в систему «школа – сельское сообщество – местная власть» через конкретные шаги на местном уровне, исходя из имеющихся реальных возможностей и ресурсного обеспечения.

**Resume.** Teachers and students are actively working to unite the disparate actions of members of the school community and residents of the territory into the “school – rural community – local government” system through concrete steps at the local level, based on the available real opportunities and resource provision.

**Ключевые слова:** устойчивое развитие, партнерство, местное сообщество, инициатива.

**Key words:** sustainable development, partnership, local community, initiative.

Деятельность педагогов и учащихся ГУО «Ходосовская средняя школа» объединяет идея социального партнерства для устойчивого развития региона. Наш основной тезис: школа – инициативный центр развития местного сообщества.

Устойчивое развитие территории, на мой взгляд, начинается с формирования положительного отношения к ней у большинства проживающих здесь людей, а также формирования первичной группы лиц (сообщества) по признаку неравнодушия и заинтересованности в развитии своего края.

В этом контексте достаточно важным становится наблюдение о том, что абсолютное большинство взрослого населения планеты достаточно инертны в социально значимой жизни своего края, т.е. в своей социальной жизни занимают позицию стороннего наблюдателя. Понимая, что успех той или иной территории как региона напрямую зависит